І.М.ЯЧМЯНЁВА
(Магілёў)

ЭЛЕМЕНТЫ ВУСНА-ГУТАРКОВАГА МАЎЛЕННЯ Ў ТВОРАХ М.ЗАРЭЦКАГА

М.Зарэцкі прыйшоў у літаратуру як самабытны пісьменнік, як мастак з яскрава выяўленым нацыянальным абліччам, які паслядоўна змагаўся за народную аснову нацыянальнай культуры.

Творы пісьменніка выдатныя тым, што адлюстроўваюць рэчаіснасць непасрэдна праз жывое, вуснае беларускае маўленне, у аснове якога – ужыванне літаратурна-гутарковых і народна- дыялектных слоў іх форм. Дзякуючы гэтаму аўтар дамагаецца рэалістычнага адлюстравання жыцця, перадае асаблівасці мовы дзеючых асоб, наогул, стварае тыповыя характары ў тыповых абставінах.

Мова твораў М.Зарэцкага багатая на элементы вусна-гутарковага маўлення. Аб гэтым сведчыць шырокае ўжыванне аўтарам слоў і словаформ на першым складзе, так званых акцэнталагічных варыянтаў: соладка, шкода, бокі, родзяць, восенны і інш.; слоў з прапушчанымі ці ўстаўленымі гукамі (літарамі): нездаволенне, зважна, застыглы, усягды, датыркнецца і інш. складаных слоў тыпу поле-жыццё, снежкі-дарожкі, куткі-закавулкі і інш.; назваў асоб з суфіксамі –к, -ун, -ец, -ак: бабылка, малодка, галавёнка, гулец, дзцёнак і інш.; дзеепрыметнікаў і прыметнікаў на –л: хаджалы, заглухлы, пахаладзелы і інш.; слоў з суфіксамі –ават, -яват: хітраваты, гультаяваты, смарчкаваты і інш.; прыставак у-(ў-) у словах з іншай прыстаўкай: удаваны, укрываць, упадабалася і інш.; слоў з падвоенымі прыстаўкамі: папарэзалі, паразвесілі, наверх, панавесілі і інш.; праклінаў: ліха на яго, пайшоў к ліхой долі, каб пярун пасмаліў і інш,; паўтораў слоў у адным сказе; ужыванне постпазіцыйных займеннікаў і прыметнікаў і інш.

Паводле слоўнікавага складу М.Зарэцкі выкарыстоўвае ўсе пласты жывой мовы беларускага народа. Вялікая колькасць разнастайных гутарковых і дыялектных слоў у творах аўтара не перашкаджае, а стварае

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

патрэбны фон, паколькі словы гэтыя самі па сабе вобразныя, гаваркія, дзейсныя і захапляючыя.

Возьмем, для пацвярджэння сказанага, некалькі прыкладаў з твораў М.Зарэцкага.

На кухні гарыць газовачка – старожка нешта поркаецца каля печы ("Вязьмо"). Я калісьці ў дзяцінстве дудкі з вярбы рабіў ды яшчэ з дзягелю майстраваў спрытныя пырскаўкі ("Голы звер"). Ён {Карызна – І.Я.} трапечыцца, нанінаецца ў адчайных патугах, і яму часам нібы ўдаецца на момант расхінуць праклятае вязьмо, але з тым большаю сілай звінаецца яно ў наступную хвіліну ("Вязьмо").

Гутарковае слова газовачка, якое абазначае назву хатняга асвятлення, вельмі ёмкае з боку характарыстычных асаблівасцей. Так, газовачка, у ТСБМ пад рэдакцыяй А.А.Атраховіча падаецца як 'самаробная лямпа, якая працуе на газе'. Лексема ўспрымаецца яшчэ і як 'слабае святло', таму "старожка нешта поркаецца". Ужытае гутарковае слова пырскаўка таксама вельмі гаворкае, бо адразу праглядваецца яго ўнутраная форма, захаваная ад дзеяслова "пырскаць". Дзякуючы ёй слова ўспрымаецца з шырокім кантэкстам асацыятыўных вобразаў і зусім незалежна ад нашага жадання выклікае ва ўсведамленні "ланцужок" іншых слоў: 1) пырскаць, 2) пырскі, 3) тое, чым пырскаюць, 4) вынік пырскання і г.д. Лексема вязьмо у ТСБМ пад рэдакцыяй А.А.Атраховіча падаецца з паметай 'абласное' са значэннем 'перавясла'. Аўтар жа ўжывае бытавое слова з пераносным значэннем для вобразнага, паэтычнага апісання з'явы. Так, вязьмо, у М.Зарэцкага – 'складанае спляценне чаго-небудзь, вузел, што прыносіць вялікія душэўныя перажыванні, хваляванні.' Трэба адзначыць, што сэнс дыялектнай лексемы вынікае з аналізу пэўнага кантэксту. Прыкладам яго з'яўляецца сама назва твора "Вязьмо".

Хочацца адзначыць, што ў М.Зарэцкага сутракаецца шмат слоў, якія ў пэўнай ступені з'яўляюцца носьбітамі чалавечых страсцей і пачуццяў. Найперш гэта эмацыянальна-экспрэсіўна-ацэначныя словы. Іх ужыванне робіць мову пісьменніка не толькі каларытнай, але яркай і самабытнай.

– Авой, усё ж ён ведае, пралаза ("Вязьмо").

– А во і не казала так, няпраўда… Маніце! Маніце! У, манюка!.. ("Вязьмо").

– Яно зразумела… Чалавек сталы, заможны, ён вагу мае, а не то што дрындушка якая!.. ("У віры жыцця").

Гутарковыя лексемы пралаза і манюка валодаюць паўнатой экспрэсіўна-вобразнага значэння слова, якое з'яўляецца вынікам творчага абыходку з каранёвай базай слова. Так, пралаза у ТБСМ пад рэдакцыяй А.А.Атраховіча падаецца як 'пранырлівы і спрытны чалавек, прайдзі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

свет' (ад пралезці); манюка – 'той, хто маніць, хто не кажа праўды, хлус' (ад маніць). Ужыванне даных лексем з эмацыянальна-ацэначнай функцыяй надае сказам адценні неадабральнасці, асуджэння. Гутарковая лексема дрындушка (паводле ТСБМ 'цацка, забаўка') выкарыстаная пісьменнікам для ацэнкі, характарыстыкі пустога, нікчэмнага чалавека. Такое абыходжанне са словам робіць яго даволі яркім з боку мастацкай экспрэсіі, бо высвечвае, паказвае і ацэньвае з'яву (у даным выпадку нікчэмнасць чалавека).

Такім чынам, выкарыстаныя розныя элементы вусна-гутарковага маўлення ў творах М.Зарэцкага надаюць ім арыгінальнасць, насычанасць, ілюстрацыйнасць і ў поўным сэнсе выконваюць эстэтычна-мастацкую функцыю.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова